УДК 902/904

# ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ПІНСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2022 ГОДЗЕ

***Алена Касюк***
*Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Гродна, Беларусь*
*kasiuk2585@gmail.com*

Дадзены артыкул прысвечаны вынікам археалагічных даследаванняў, якія былі праведзены аўтарам у 2022 г. на тэрыторыі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Прадстаўлена гісторыя археалагічнага вывучэння помнікаў, аналіз сабраных матэрыялаў, іх культурна-храналагічная інтэрпрэтацыя.
***Ключавыя словы: археалогія, артэфакты, Пінскі раён, крэмень, рымскі час***

# RESULTS OF ARCHAEOLOGICAL RESEARCH ON THE TERRITORY OF PINSK DISTRICT BREST REGION IN 2022

***Alena F. Kasiuk***
*Hrodna State Museum of History and Archaeology, Hrodna, Belarus*

This article is devoted to the results of archaeological research, which were carried out by the author in 2022 on the territory of Pinsk district Brest region. Presented history of the archaeological study of the settlements, analysis of the collected materials and their cultural and chronological interpretation.
***Keywords: archeology, artifacts, Pinsk district, flint, Roman time***

**Уводзіны.** Улетку 2022 г. аўтарам артыкула былі праведзены археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці з мэтай агляду вядомых помнікаў археалогіі і пошуку новых аб'ектаў, у першую чаргу – жалезнага веку і эпохі ранняга Сярэднявечча. Маршрут разведак праходзіў уздоўж левага берага Прыпяці ад вёскі Стытычава на поўначы, праз Сачкавічы, да вёскі Красава на поўдні (Мал. 1). Да 2022 г. гэты ўчастак левага берага Прыпяці археолагамі не абследаваўся. Таксама была агледжана тэрыторыя на

супрацьлеглым, правым беразе Прыпяці каля вёсак Кнубава, Веляцічы, Малыя Дзікавічы. На левым беразе Прыпяці намі былі ўпершыню агледжаны паселішчы Стытычава 1, Сачкавічы 1, Красава 1, на правым – абследаваны вядомы помнік Кнубава 1, а таксама зафіксаваны новыя помнікі Кнубава 2, Веляцічы 1, Малыя Дзікавічы 1, Малыя Дзікавічы 2.




**Малюнак 1. Карта маршрута археалагічных разведак, праведзеных у 2022 г. на тэрыторыі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці**.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы зварот калекцыі матэрыялаў, атрыманай падчас разведак на тэрыторыі Пінскага раёна ў 2022 г.

**Асноўная частка.** Паселішча ***Стытычава 1*** зафіксавана намі каля в. Стытычава (Плешчыцкі с/с), на беразе р. Ступа (правы прыток р. Піна), на пясчаным узвышшэнні памерамі 130 х 200 м[1]. Помнік пашкоджаны ветравой эрозіяй, паверхня слаба задзернаваная. Культурны пласт прадстаўлены пяском светлага жоўта-шэрага колеру. Падчас агляду помніка ў 2022 г. і праведзеных паверхневых збораў, была атрымана калекцыя артэфактаў розных эпох: ад каменнага веку да Найноўшага часу. Сярод крамянёвых матэрыялаў (45 адз.): фрагмент біфасіяльнай прылады; 2 скрабачы; рэшткавы фрагмент нуклеуса ад пласцін са слядамі двухпляцовачнасці; пласціна рэтушаваная (укладыш у серп) (Мал. 2: 1); пласціна рэтушаваная, падскарыністая (Мал. 2: 2); адыстальная пласціна; 3 адшчэпы рэтушаваныя, падскарыністыя; 5 адшчэпаў падскарыністых; 6 адшчэпаў і 1 фрагмент адшчэпа; фрагмент адшчэпа падскарыністага; 1 адшчэп рэтушаваны і фрагмент адшчэпа рэтушаванага; адшчэп (тэрмічнае ўздзеянне); адшчэп падскарыністы (тэрмічнае ўздзеянне); 5 фрагментаў адшчэпаў (тэрмічнае ўздзеянне); адшчэп падрабрысты; адшчэп са слядамі ўтылізацыі; 2 абломкі крамянёвыя (1 – са слядамі тэрмічнага

[1] У мэтах аховы аб'екта археалогіі ад разбуральнай дзейнасці аматараў прыборнага металапошуку, яго дакладная лакалізацыя ў артыкуле не прыводзіцца.

ўздзеяння); скол патанчэння плоскасці сколвання; 7 лускавінак (1 – са слядамі тэрмічнага ўздзеяння); лускавінка са слядамі жаўлачнай скарынкі. Калекцыя крамянёвых артэфактаў датуецца неалітам – бронзавым векам.




**Малюнак 2. Археалагічныя артэфакты з помнікаў Стытычава 1 (1-2, 6-24), Сачкавічы 2 (3-5), знойдзеныя падчас даследаванняў у 2022 г. 1-5 – малюнкі А.Д. Гаршкова, 6-24 – малюнкі А.Ф. Касюк.**

Індывідуальныя знаходкі наступных эпох прадстаўлены: пацеркай шкляной двухчасткавай (Мал. 2: 11). Яна зроблена з глухога шкла фіялетавага колеру. Часткі пацеркі асіметрычныя, бакавіны крыху прыплюснутыя. Даўжыня 1 см, дыяметр 0,6 і 0,7 см. Канал прамы, дыяметр канала 0,15 см. Знаходка блізкая да тыпу TM-97a, такія пацеркі былі распаўсюджаны на тэрыторыі еўрапейскага Барбарыкума на працягу фазы C1b-D1 (каля 220-260 гг. – 375-400 гг.) [1, S. 33–35, Tafel 2].

На помніку Стытычава 1 быў знойдзены жалезны выраб (ці яго фрагмент) у выглядзе пласціны даўжынёй 3,25 см, шырынёй 0,6-0,7 см, таўшчынёй 0,25-0,3 см (Мал. 2: 12). Вызначыць функцыянальную прыналежнасць знаходкі і храналогію даволі складана. Таксама знойдзены металічны нацельны крыжык (Мал. 2: 24). Верхняя частка абламаная. Памеры фрагмента 1,95 х 2,3 см. На ліцавым баку выява ўкрыжаванага Ісуса Хрыста, на адваротным – надпіс ГОСПОДИ СПАСѢ. Ніжэй – “М.Ж.” “Р.Е.” Крыжык датуецца пачаткам XX ст[2].

Сярод выяўленых прадметаў узбраення: куля свінцовая круглая (шрапнель) (Мал. 2: 23). Яе дыяметр 1,4-1,5 см. Вага – 20 г. На паверхні маюцца некалькі пляскатых участкаў. Такія кулі выкарыстоўваліся для гладкаствольных стрэльбаў ад іх з’яўлення да XIX ст. уключна. Таксама была знойдзена гільза ад патрона 7,92х57 мм, якія выраблялiся з 1920 па 1925 г. у г. Кракаў (Польшча)[3].

На помніку Стытычава 1 знойдзена 78 фрагментаў ляпных пасудзін. Венцы гаршкоў адхіленыя вонкі, у некаторых выпадках – арнаментаваныя акруглымі адтулінамі (Мал. 2: 6-10). Шыйкі кароткія (Мал. 2: 13-14). На некалькіх сценках маецца арнамент – рады “тычкоў” (Мал. 2: 16), тонкія драпіны (Мал. 2: 15). Паверхня пасудзін

[2] Вызначэнне храналогіі нацельнага крыжыка было праведзена навуковым супрацоўнікам аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі” А.А.Кунашам, за што выказваем даследчыку шчырую падзяку.

[3] Internet-крыніца: Маркировка на гильзах патронов 7,92х57мм Польша - Общий раздел истории оружия - GunsForum | Оружейный Форум. Дата доступу – 17.03.2023

загладжаная (у некаторых выпадках – вельмі гладкая) ці шурпатая, на двух фрагментах верагодна прысутнічае дадатковая абмазка вадкай глінай. У цеста ўведзена дамешка дробназярністай жарствы, у адным выпадку, верагодна, прысутнічае дамешка шамоту. Фрагменты слаістыя; светла-чырвонага, цёмна- і светла-шэрага, светла-карычневага, чорнага колераў. Культурна-храналагічная прыналежнасць выяўленай ляпной керамікі наступная: некаторая частка сценак можа адносіцца да бронзавага веку; венцы з адтулінамі, найбольш верагодна, паходзяць ад пасудзін мілаградскай культуры ранняга жалезнага веку; асноўная маса керамікі датавана намі рымскім перыядам; некалькі фрагментаў могуць адносіцца да эпохі ранняга Сярэднявечча.

Фрагментаў кругавых пасудзін Новага часу выяўлена 10 (6 венцаў (Мал. 2: 17-22), 2 ручкі, 1 сценка, 1 донца). Кераміка брудна-белага, чырванаватага і шэрага колераў. Аб занятках металургіяй сведчаць 2 знойдзеныя шлакі.

Паселішча _**Сачкавічы 1**_ зафіксавана намі праз 0,5 км на поўдзень ад в. Сачкавічы (Плешчыцкі с/с), на левым беразе р. Прыпяць (пойменнай часткі ракі з невялікімі старычнымі азёрамі). Археалагічныя матэрыялы былі знойдзены на агаленнях культурнага пласта на супрацьпажарных палосах, якія цягнуцца ўздоўж схіла берага на працягу 200 м і на 10-15 м у шырыню. Усходняя і заходняя часткі помніка знаходзяцца пад лесам, цэнтральная высечаная. На помніку былі знойдзены: нуклеус ад пласцін і адшчэпаў, перароблены на нарыхтоўку біфасіяльную; праксімальная частка пласціны; фрагмент адшчэпа рэтушаванага, падскарынiстага. Кераміка прадстаўлена 5 сценкамі ляпных пасудзін жалезнага веку з шурпатай паверхняй, дамешкай жарствы і шамоту ў цесце; 2 сценкамі кругавых пасудзін Новага часу. Таксама на помніку была знойдзена гільза ад патрона 7,92х57 мм да вінтоўкі Mauser.[4]

Паселішча _**Сачкавічы 2**_ размешчана праз 1 км на поўдзень ад в. Сачкавічы, на левым беразе р. Прыпяць (пойменнай часткі ракі з невялікімі старычнымі азёрамі). Археалагічныя матэрыялы былі знойдзены на агаленнях культурнага пласта на супрацьпажарных палосах, якія цягнуцца ўздоўж схіла берага на працягу 500 м і на 10-15 м у шырыню. Усходняя частка помніка засаджаная лесам, заходняя – раней была пад лесам, сёння высечаная. У калекцыі крамянёвых артэфактаў (24 адз.) знаходзяцца: скол аднаўлення пляцоўкі нуклеуса, рэтушаваны (?); рабрыстая пласціна рэтушаваная (тэрмічнае ўздзеянне) (Мал. 2: 3); праксімальная частка пласціны (тэрмічнае ўздзеянне); адыстальная падрабрыстая пласціна (Мал. 2: 4); адшчэп рэтушаваны; адшчэп рэтушаваны, падскарыністы; фрагмент адшчэпа рэтушаванага, падскарынiстага (тэрмічнае ўздзеянне) (Мал. 2: 5); 2 адшчэпы; 5 адшчэпаў падскарынiстых; 2 фрагменты адшчэпаў падскарынiстых; 2 фрагменты адшчэпаў падскарынiстых (тэрмічнае ўздзеянне); фрагмент адшчэпа (тэрмічнае ўздзеянне); фрагмент адшчэпа рэтушаванага, падскарынiстага; фрагмент адшчэпа; 3 лускавінкі (1 – са слядамі тэрмічнага ўздзеяння). Таксама на помніку знойдзена сценка ляпной (?) пасудзіны чырвонага колеру, 2 венцы і ручка кругавых пасудзін Новага часу.

Помнік _**Красава 1**_ размешчаны ў заходняй частцы в. Красава (Плешчыцкі с/с), праз 80 м на поўдзень ад вуліцы Цэнтральная, на пустыры паміж жылымі будынкамі па адрасе вул. Цэнтральная, 19 і 19А на левым беразе р. Прыпяць. Археалагічныя матэрыялы зафіксаваныя на дарозе і на ўчастку памерамі 15 х 20 м (паміж сядзібамі). На паверхні помніка былі знойдзены: рабрыстая пласціна падскарынiстая са слядамі ўтылізацыі; 3 фрагменты жаўлакоў са слядамі апрацоўкі.

На правым беразе Прыпяці ў 2022 г. быў абследаваны вядомы помнік Кнубава 1, а таксама ўпершыню агледжаны помнікі Кнубава 2, Веляцічы 1, Малыя Дзікавічы 1, Малыя Дзікавічы 2.

У 1965 г. археалагічныя разведкі па правым беразе Прыпяці правёў У.Ф. Ісаенка. Каля в. Кнубава, праз 1,5 км на поўнач ад вясковых могілак, на краі астанца тэрасы левага берага р. Прыпяць (Струменя), на паўднёвы ўсход ад шасейнага моста праз раку былі зафіксаваны сляды паселішча _**Кнубава 1**_ [2, С. 25]. Адзначана, што помнік разбураўся кар’ерамі па здабычы пяску. Сярод знаходак У.Ф. Ісаенка пералічвае фрагменты пасудзін з жарствой у цесце і невысокім адхіленым вонкі венцам, фрагменты неалітычнай пасудзіны з вялікай колькасцю раслінных дамешкаў, фрагменты пасудзін сярэднебронзавага часу з лінейным арнаментам. Крэмень прадстаўлены некалькімі адшчэпамі і пласцінкамі, праколкай? на канцы пласцінкі, скобелем на адшчэпе, трапецыяй з увагнутымі бакавымі старанамі.

У 1980 г. помнік Кнубава 1 агледзела В.С. Вяргей [3, С. 18]. У ваколіцах вясковых могілак, з усходу і поўначы ад іх былі знойдзены крамянёвы нож, 7 адшчэпаў, 5 фрагментаў кругавой керамікі эпохі позняга Сярэднявечча, 1 фрагмент пасудзіны эпохі бронзы са шнуравым арнаментам, 1 – з чарвячным і 3 абломкі ляпной керамікі эпохі жалеза.

У 2022 г. быў абследаваны край астанца тэрасы правага берага р.Прыпяць, тут размешчаны могілкі аг. Плешчыцы. Супаставіўшы прывязку вядомага помніка Кнубава 1, пададзеную У.Ф.Ісаенкай і В.С.Вяргей, мяркуем, што гэта як раз ён, бо знаходзіцца праз 1,6 км на поўнач ад вясковых могілак в.Кнубава, праз 1,3 км на паўднёвы ўсход ад шасейнага моста праз Прыпяць, толькі не на левым (паводле У.Ф.Ісаенкі), а на правым беразе ракі (мяркуем, што гэта памылка, паколькі агляд мясцовасці на супрацьлеглым беразе наяўнасці падобнага помніка не паказаў).

Падчас агляду паселішча Кнубава 1 у 2022 г. на захад і поўдзень ад могілак (аг. Плешчыцы) былі знойдзены: медыяльная частка пласціны рэтушаваная, падскарынiстая; лушчнёвы скол; адшчэп са слядамі

[4] Internet-крыніца: Легендарный 7.92х57 Mauser (Часть I) - Статьи об оружии и боеприпасах (weaponland.ru). Дата доступу – 17.03.2023

ўтылізацыі; сценка ляпной пасудзіны жалезнага веку; 5 венцаў, 5 сценак і 2 донцы кругавых пасудзін Новага часу.

Помнік ***Кнубава 2*** размешчаны праз 0,25 км на паўднёвы захад ад паўднёвай ускраіны в. Кнубава, на правым беразе р. Прыпяць, каля старарэчышча. На агаленнях культурнага пласта (пясок светла-жоўтага колеру) быў знойдзены фрагмент сценкі грубаляпной пасудзіны з дамешкай жарствы ў цесце. Таўшчыня сценкі 0,75-0,8 см; колер светла-жоўты і шэры.

Помнік ***Веляцічы 1*** размешчаны праз 1,1 км на паўднёвы захад ад паўднёвай ускраіны аг. Веляцічы, на поўдзень ад дарогі ў в. Малыя Дзікавічы, на пясчаным узвышэнні ў пойме Прыпяці. На гэтым узвышэнні сёння знаходзіцца пясчаны кар’ер. На агаленнях культурнага пласта былі знойдзены: адшчэп рэтушаваны, падскарыністы; лускавінка.

Помнік ***Малыя Дзікавічы 1*** размешчаны праз 0,7 км на паўночны ўсход ад в. Малыя Дзікавічы, на пясчаным узвышэнні ў пойме Прыпяці. Праз гэтае ўзвышэнне праходзіць дарога (пясчаная) ў в. Малыя Дзікавічы, таксама значная яго частка знішчана пясчаным кар’ерам. На агаленнях культурнага пласта былі знойдзены 2 сценкі ляпных пасудзін светла-шэрага і чырвонага з чорным колераў, з дамешкай жарствы ў цесце.

Помнік ***Малыя Дзікавічы 2*** размешчаны праз 0,2 км на захад ад в. Малыя Дзікавічы, на пясчаным узвышэнні ў пойме Прыпяці. Сёння тут знаходзіцца невялікі пясчаны кар’ер. На агаленнях культурнага пласта былі знойдзены 2 адшчэпы рэтушаваныя, а таксама донца ляпной пасудзіны чырвонага і шэрага колераў з дамешкай жарствы і падсыпкай пяску на ніжняй паверхні.

**Высновы.** Такім чынам, у выніку археалагічных даследаванняў, праведзеных у 2022 г. на тэрыторыі Пінскага раёна па берагах р.Прыпяць, быў агледжаны вядомы помнік Кнубава 1, а таксама зафіксаваны 8 новых аб’ектаў з матэрыяламі каменнага веку, эпохі жалеза і Новага часу. Найбольш прадстаўнічая калекцыя была атрымана на помніку Стытычава 1. Па наяўных матэрыялах паселішча датуецца неалітам – бронзавым векам, раннім жалезным векам (мілаградская культура), рымскім перыядам, верагодна, эпохай ранняга Сярэднявечча, Новым і Найноўшым часам.

1. Tempelmann–Mączyńska M. Die Perlen der römischen Kaiserzeit und der frühen Völkerwanderungszein im mitteleuropäischen Barbaricum. Band 43. Mainz am Rhein: RGF. – 1985. – 339 s.
2. Исаенко В.Ф. Отчёт о полевых исследованиях за 1965 г. / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 258. – 35 с., 20 рис.
3. Вергей В.С. Отчёт о полевых археологических исследованиях в Пинском и Ивацевичском районах Брестской области в 1980 году / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 697. – 27 с., 108 ил., 15 с. кол. оп.